Абодва мастакі паказваюць знітаванасць чалавека з прыродай. Як і характар чалавека, яна (прырода) бывае рознай, зменлівай, і кожны з творцаў бачыць яе па-рознаму. Так, Бялыніцкі-Біруля і М.Багдановіч праз сваю творчасць імкнуліся перадаць узаемасувязь прыроды і чалавечых пачуццяў, нават перадаць тую атмасферу і час, у які яны жылі.

Бацькаўшчына ніколі не забывае тых, хто свой талент і нават жыццё кладзе на яе алтар. Так, у Мінску створаны літаратурны музей М. Багдановіча, у Магілёве – мастацкі музей В. Бялыніцкага-Бірулі, вуліцы названы ў гонар паэта і мастака.

Матэрыял даследавання можна выкарыстоўваць на ўроках беларускай мовы і літаратуры, сусветнай і айчыннай культуры, на факультатыўных занятках, пры правядзенні прадметных тыдняў, пры арганізацыі экскурсій і паездак, у працэсе самастойнага вывучэння класікаў беларускай літаратуры і жывапісу.
Прадуктам даследавання з'яўляецца відэаролік "Пейзаж настрою ў паэзіі Максіма Багдановіча і жывапісе Вітольда Бялыніцкага-Бірулі".

УДК 398.1(476.2)

Вуч. Г.А. Астрэйка
Навук. кір. Сямёнава А.У., настаўнік беларускай мовы і літаратуры
(ДУА «Сярэдняя школа № 7 г. Баранавічы»)

## МАГІЯ СЛОВА ЧАРОЎНАГА (ЗАМОВЫ Ў ГАСПАДАРЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ЖЫХАРОЎ БАРАНАВІЦКАГА КРАЮ)

**Уводзіны.** На календары вечнасці – 21 стагоддзе, эпоха навукова-тэхнічнай рэвалюцыі, эпоха біёнікі і электронікі… Узброены ведамі чалавек ужо абганяе сёння самую смелую фантазію, самыя няўрымслівыя мары. Мы ж імкнемся да адкрыцця новага. І таму жывая цікавасць, якую выклікаюць беларускія замовы, невыпадковая. Яшчэ задоўга да таго, калі мастацкае слова было зафіксавана ў помніках пісьменнасці, народ выяўляў свае настроі і думы ў песнях, замовах, легендах і паданнях, якія былі першымі праявамі яго мастацкай творчасці. Даволі значны час мы ігнаравалі замовы як фальклорны жанр, пазбаўлялі сябе магчымасці задумацца над глыбокімі асновамі слова, якое здаўна надзелена магічным значэннем.У арсенале народнай педагогікі слова як стымул, як сродак уплыву на псіхічны стан чалавека займала важнае месца. Сёння мы, як

ніколі, адчуваем вялікую патрэбу ў звычайных, гаючых, пяшчотных, бадзёрых, душэўных словах, у якіх былі б закладзены добрыя магічныя інтанацыі, станоўчыя эмоцыі. Чаму нас сёння так вабяць замовы? Эмацыянальна-хвалюючa, але дакладна адказала на гэта пытанне даследчыца гэтага жанру Г.А. Барташэвіч: “Мы ўсе з’яўляемся сведкамі ўзрастання цікаўнасці замоў, бо яны заснаваны на веру ў магічную сілу слова. Усім нам вельмі хочацца, каб нехта адагнаў хваробу, усяліў упэўненасць і надзею на лепшае”[1, 35 с.]. Наш край не багаты на помнікі сівой даўніны многіх мясцовасцях нашага краю зусім знікла вера ў цудадзейную сілу замовы. Патроху перамерлі прадстаўнікі старога пакалення – усе гэтыя “калдуны”, “ведуны”, “варажцы”… Разам з калдунамі зніклі і іх замовы, нагаворы і прыгаворы. Паўсюдна прыходзіцца лічыцца з шырока распаўсюджаным перакананнем, што замова дзейнічае толькі ў тым выпадку, калі яе ведае толькі адзін чалавек. Паведамляючы замову каму бы та ні было, калдун тым самым перадае і ўсю яе моц. Сёння трэба пашыраць цікавасць да культуры і гісторыі свайго краю, трэба не забывацца на тое, што асаблівасці пэўнай мясцовасці могуць проста знікнуць, калі знікне памяць пра іх. Выправіць гэтую несправядлівасць мы ўзяліся, вывучаючы замовы гаспадарчай дзейнасці Баранавіцкага краю.

**Асноўная частка.** На ранніх ступенях свайго развіцця мастацтва мела не столькі эстэтычнае, колькі ўтылітарна-практычнае значэнне. Да такога тыпу мастацтва можна аднесці замовы. Гэта архаічны жанр фальклору, які дае ўяўленне аб асаблівасцях мыслення першабытнага чалавека.

Замовы былі выкліканы да жыцця працоўнай практыкай чалавека, яго гаспадарчымі патрэбамі, функцыі іх былі накіраваны на здзяйсненне жадаемага. Замоўныя формулы–гэта цудоўны матэрыял для даследавання светапогляду старажытнага чалавека, яго эвалюцыі, гэта той матэрыял, у якім побач з забабоннымі ўяўленнямі нашых далёкіх продкаў, іх памылковымі ацэнкамі з'яў навакольнай рэчаіснасці мы знаходзім і шмат рацыянальнага.

Сістэматычнае вывучэнне замоў пачынаецца з канца XIX стагоддзя. У гісторыі збірання, публікацыі і тэарэтычнага аэнсавання твораў замоўнага жанру можна вылучыць некалькі перыядаў (за аснову перыядызацыі мы прынялі гады выхаду ў свет тых ці іншых выданняў): 1890-1916 гг.; 1963-1979 гг.; з 1990 г. і па сённяшні дзень. У гэтай сувязі каштоўнасць уяўляюць працы Е. Раманава , П. Шэйна , М. Доўнар-Запольскага, А. Багдановіча , Я. Карскага .

“Замова – гэта своеасаблівая славесная формула, якая паводле прымхлівых уяўленняў мае магічную сілу– здольна абавязкова ўздзейнічаць у пажаданым кірунку на знешні свет” [3, 54 с.].

Найбольш прымальнай да беларускага матэрыялу даследчыца Г.А.Барташэвіч лічыць наступную класіфікацыю замоў:

- *замовы гаспадарчага характару* (пры паляванні, лоўлі рыбы, пры развядзенні пчол, пры сельскагаспадарчых работах, пры першым выгане жывёлы на пашу, для захавання статка, пры пажары, пры пабудове хаты);
- *ахоўныя замовы ад злых духаў і шкодных істот, прыродных з'яў* (ад перуна, ад дамавога, ад хлеўніка, ад лесавіка, ад ведзьмы, чараўнікоў, ад залому, ад нячыстай сілы, “нарадкі”, “падвею”);
- *ахоўныя замовы ад звяроў* (ад гадзюкі, ад ваўкоў, сабак, ад шалу);
- *замовы ад хвароб*;
- *любоўныя замовы* (прысушкі і адсушкі);
- *замовы сацыяльнага зместу* (ад несправядлівага суда, салдацкія, ад “ворагаў”).

З мэтай даследавання ведаў вучняў пра замовы, мы правялі апытванне сярод вучняў 10 «Б» класа і іх бацькоў. Было апытана 40 чалавек. Вынікі апытвання атрымаліся сумныя: з 40 чалавек –16 не ведаюць замовы, 13 чалавек ведаюць больш за дзве замовы. А астатнія – толькі па адной. Гэты сумны момант прымусіў нас задумацца над гэтай праблемай і адправіў нас у цікавую вандроўку.

На карце Баранавіцкай зямлі ёсць вёскі старыя і новыя, вялікія і малыя. Кожная з іх – своеасаблівая, па-свойму адметная. Нават не кожны горад можа пахваліцца такім багатым мінулым, якое ёсць у некаторых з вёсачак. Вельмі прыемна, што гэтае мінулае не зарасло быльнягом, а перадаецца з пакалення ў пакаленне, што яно захавалася ў памяці старажылаў і ўвасоблена ў цудоўных замовах. Для нас асаблівай каштоўнасцю былі менавіта такія замовы, пачутыя з першых вуснаў, што тлумачылі ахоўную гаспадарчую формулу нашых продкаў. З іх дапамогай можна прасачыць моўнае багацце мясцовай гаворкі, развіццё народнай думкі, уяўленні людзей пра сваё мінулае і, канешне, іх сувязь з беларускай міфалогіяй. Безумоўна, нам хацелася сабраць у гэтай экспедыцыі ўсе замовы гаспадарчай дзейнасці, але мы былі вельмі задаволены і тымі, якія помнілі людзі, каб на гэтых прыкладах паказаць, наколькі каларытны фальклор на нашай роднай зямлі.

Вось якую замовы ад дамавога мы пачулі ад Цімчык Надзеі Іванаўны, 80 гадоў, жыхарка вёскі Сталовічы: ***"Дамавік, дамавік, ідзі шукай лесавіка. Тут табе не бываць і ўрэда не дзелаць ні схода, ні малода, ні пад поўна, ні маладзіком, ні вавек вяком".***

Пазняк Андрэй Міхайлавіч, жыхар вёскі вёска Коўбавічы паведаміў нам замову для лоўлі рыбы: ***"Ідзі, рыбка, і зноў у ваду, пайшлі дзядзьку, пайшлі маці, пайшлі брата і бацькі, усіх, хто старэй, пасылай, а ты зноў ідзі гуляй".***

**Заключэнне.** Народная творчасць уяўляе чароўную, мудрую кнігу, якая кожнаму пакаленню разгортвае ўсё новыя старонкі. Вялікае месца ў гэтай кнізе займаюць замовы, што складаюць важнейшую частку беларускага народнага фальклору. Замова–гэта выказанае словамі пажаданне, спалучанае з пэўным абрадам ці без яго, пажаданне, якое павінна абавязкова здзейсніцца. У рабоце прадстаўлены замовы гаспадарчай дзейнасці Баранавіцкага краю розных відаў: пры паляванні, лоўлі рыбы, пры развядзенні пчол, пры сельскагаспадарчых работах, пры першым выгане жывёлы на пашу, для захавання статка, пры пажары, пры пабудове хаты, ахоўныя замовы ад злых духаў і шкодных істот, прыродных з'яў, ад перуна, ад дамавога, ад хлеўніка. Нам хочацца верыць, што такое цікавае падарожжа зможа навучыць юнакоў і дзяўчат захоўваць духоўны скарб сваёй малой радзімы.Мы верым, што ў сэрцах падлеткаў ніколі не забудзецца прывабны куток нашага краю.Мы імкнуліся занатаваць тое, што яшчэ жыве, цепліцца ў людской памяці, каб маладыя людзі, спасцігаючы "малое", зразумелі "вялікае", усвядомілі сябе нашчадкамі багатай беларускай культурнай спадчыны. Вельмі важна, каб мы адчулі ўнутраную патрэбу ў глыбокай еднасці з роднай зямлёй, з бацькоўскім краем.

Такім чынам, мы прыйшлі да высновы, што ў Баранавіцкім краі замоў становіцца менш, але яны перадаюцца з вуснаў у вусны, што садзейнічае духоўнаму выхаванню моладзі.

## ЛІТАРАТУРА

1. Барташэвіч, Г.А. Магічнае слова / Г.А. Барташэвіч. – Мінск, 1990.
2. Грынблат, М.Я. Замовы / М.Я. Грынблат // У кн.: Беларуская народная вусна-паэтычная творчасць. – Мінск, 1967.
3. Крушевский, Н. Заговоры как вид русской народной поэзии / Н. Крушевский // Варшавские университетские известия. – Варшава, 1876. – № 3.